*Агмень* паўстаньня, сямейны *агмень*, *агмяні* й паходні, *агмень* душы — гэтыя выразы напоўнілі нашу літаратуру. *Агменны*, *агмянёвы*, *агмяністы* — гэтыя словы сталі магчымыя і вабныя. І цяжка цяпер уявіць нашу мову бязь іх.

## Агітацыя

***Віталь Цыганкоў***

Ці не выклікае ў вас слова *агітацыя* асацыяцыю са словам *агіда*?

Беларуская *агітацыя* паходзіць з лацінскага *agitatio*, што азначае „прывядзеньне ў рух". У жыцьцё і мову гэтае слова шырока ўвайшло толькі ў савецкі час, калі паняцьце *агітацыя* набыло нэгатыўна-ідэалягічны сэнс. Камуністычная *агітацыя*, масавая *агітацыя*, наглядная *агітацыя*. Гэткае самае адмоўнае стаўленьне знайшло сваё адлюстраваньне і ў гутарковай мове: „Што ты мяне *агітуеш*?", „Яшчэ тут *агітатар* знайшоўся..." і нават „*Агітуй не агітуй...*".

А новаўтварэньні якія красамоўныя! *Агіткалектыў*, *агітплякат*, *агітка*, *агітпрап*. Калі нехта забыўся значэньне апошняга слова, нагадаем, што гэта „*агітацыя і прапаганда*". Тыя, каму выпаў гонар альбо няшчасьце вучыцца на факультэце журналістыкі ў савецкі час, на ўсё жыцьцё запомнілі цытату зь Леніна: „Газэта — ня толькі калектыўны прапагандыст і калектыўны *агітатар*, але таксама і калектыўны арганізатар".

*Агітатар* — чалавек, перад якім ня хочацца адчыняць дзьверы свайго дому.

## Адгазьнік

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

Слова *адгазьнік* нарадзілася пару гадоў таму ў нашай рэдакцыі як адпаведнік слову *працівагаз*, якое ў беларускай мове мае яшчэ адпаведнікі *проціаз* і *супрацьгаз*.

Апошняе фігуравала на старонках беларускіх раёнак у 20—40-я гады, калі папярэднік ДОСААФу — ОСОАВІАХІМ (Таварыства спрыяньня абароне, авіяцыі і хімічнаму будаўніцтву) вяло сярод насельніцтва актыўную працу ў справе абароны ад магчымага вонкавага агрэсара. Менавіта тады модна было рапартаваць, што ў такім і такім калгасе працоўная брыгада і конь паўгадзіны завіхаліся на полі ў *супрацьгазах*.

Першы вугальны *адгазьнік* быў створаны ў 1916 годзе акадэмікам Мікалаем Зялінскім. Адкрыцьцё было выкліканае тым, што 24 красавіка 1915 году ў бітве пры Іпры ў Бэльгіі нямецкае войска ўпершыню ў гісторыі ўжыло *атрутны газ* у якасьці зброі. У часы першай сусьветнай вайны *газавыя атакі* былі і на тэрыторыі Беларусі.

Недзе ў 70-ых у горадзе вялікай нафтахіміі Наваполацку хадзілі чуткі, што насельніцтву, на ўсялякі выпадак, раздадуць *адгазьнікі*. Чуткі хадзілі — *адгазьнікаў* не давалі. Напэўна, баяліся, што „народныя ўмельцы" прыстасуюць гэтую рэч пад іншыя патрэбы, скажам, будуць у іх апырскваць сад альбо бяліць хату. Зрабілі ж тамтэйшыя вудалі з *адгазьніцкай* торбы валізку для